bipart

Belarusian Institute for Public Administration Reform and Transformation

The art of public administration

PUBLIC ADMINISTRATION NEWS DIGEST № 102, 2026

# Public Administration in Belarus: May - June 2026

**This digest provides an overview of key developments in the public administration in Belarus during May and June 2026, including new appointments in the government, signs of an upcoming reshuffle in the security forces, staff rotation in large state-owned enterprises, and changes in the presidential administration and the diplomatic corps. The digest also examines a new bill strengthening state control over religious affairs and record-high financial compensation for officials.**

# Дзяржаўнае кіраванне ў Беларусі ў траўні – чэрвені 2026 г.

**Новы выпуск дайджэста змяшчае агляд ключавых навін у дзяржаўным кіраванні ў Беларусі ў траўні – чэрвені 2026 г., у тым ліку новыя прызначэнні ва ўрадзе, сігналы будучых перастановак сілавікоў, ратацыі ў буйных дзяржаўных прадпрыемствах, Адміністрацыі прэзідэнта і дыпламатычным корпусе. У дайджэсце таксама разглядаюцца новы законапраект, які ўзмацняе дзяржаўны кантроль над рэлігійнай сферай, і рост заробкаў чыноўнікаў.**

## News from BIPART




In May, BIPART published a new study, [Mini-Lukashenkas in the Regions: Power, Control, and Personnel Policy in Belarusian Regional Executive Committees](), examining the role of regional

executive committees within Belarus's system of state governance. The report analyses how the regional power vertical operates, the logic behind regional appointments, and how the role of executive committees has evolved since the 2020 protests.

In June, BIPART published a new study on the role of the Presidential Administration, arguing that it has transformed from a support body serving the head of state into the central hub of political decision-making and control. The report examines the institution’s expanding authority over virtually all policy and governance areas, as well as its growing supervisory role following the 2020 political crisis.

## Public administration news (May - June 2026)




# Changes in the Government

### New minister of natural resources

On 11 June, Maksim Lysenka was appointed as Minister of Natural Resources and Environmental Protection. The position became vacant after the former minister, Siarhei Masliak, was detained on corruption charges, a rare case of a senior official being prosecuted for corruption. It is a promotion for Lysenka, who previously served as first deputy minister in the same ministry. This routine staffing decision underscores the largely performative nature of Alyaksandr Lukashenka’s corruption fight, where criminal cases are used to bolster the incumbent’s image in state media or to discipline officials. Prosecuted officials are simply replaced by their deputies, with only a fraction of detainees sent to prison – and those who are often serve relatively brief sentences.

Lysenka was born in 1984 and holds three degrees: in forestry from State Technical University, and in economics and management from the Minsk Institute of Management and the Academy of Public Administration under the President. His career trajectory is typical of many Belarusian ministers: he has spent nearly his entire professional life within the same ministry, with a stint in local government “for professional development”. After working for more than a decade in the regional branches of the Ministry of Natural Resources, he served as a chairman of the Dziarzhynsk District Executive Committee between 2021 and 2025 before returning to the ministry.

## Transfer of wildlife inspectorate to government fuels speculation of security bloc reshuffle

Appointing the new Minister of Natural Resources, Lukashenka announced plans to transfer the State Inspectorate for Flora and Fauna Protection from his direct control to the ministry. Although the powers of the inspectorate will likely remain unchanged, the decision would represent a clear loss of status for both it and its head, Yury Tsertsel, the brother of KGB chief Ivan Tsertsel. Whilst the change may be simply administrative, it has prompted speculation that the "Tsertsel clan" has lost favour within the system. Analysts argue that it could signal the gradual sidelining of the current security elite ahead of an upcoming reshuffle in security forces, allowing the regime to project an image of change.

Previous reshuffles within the security apparatus support this interpretation. The December appointments of former KGB officials as Head of the Investigative Committee and the Prosecutor General suggested a shift towards manipulation and targeted coercion over blunt-force repression, although the latter is still widely used. Human rights organisations note the current prevalence of "hidden repressions", whereby closed trials, secrecy, and intimidation conceal ongoing persecution whilst maintaining the same level of pressure on society. A recent example is the persecution of students from the European Humanities university: mass detentions, searches and arrests continue despite official denials, and public rhetoric increasingly aims at downplaying repression.

Another signal of a future reshuffle is the number of senior security officials approaching retirement age. In May the 68-year-old Deputy Prosecutor General, Aliaksei Stuk, was sent into retirement. He held the post since 2008 and independent media saw him as one of the architects of the regime's mass repression. The heads of the main security agencies were appointed back in 2020, making their tenures unusually long by the regime's standards, as it relies on regular reshuffles. Upcoming rotation will also likely affect the military: Lukashenka announced preparations for personnel changes in the army, following a recent inspection. This makes continued security sector rotations a plausible prospect in the years ahead.

## Changes in the local administration

### New head of Homiel city

On 12 May, Ruslan Parkhamovich was appointed head of Homiel City Executive Committee. Born in 1980 in Mahilyou, he holds degrees in construction and accounting from Mahilyou State Technical University (now called the Belarusian-Russian University) and the Academy of Public Administration under the President. For the past year he served as Lukashenka's assistant-inspector in the Homiel region, and before that as Minister of Architecture and Construction (2020-2025). Parkhamovich's public profile shows no professional experience in the Homiel region, aside from his previous position, and his appointment has been interpreted by independent media as a sign of staff shortages. In June, independent media reported that a criminal investigation over alleged fraud had been

opened against former Homiel city head Uladzimir Pryvalau shortly after his dismissal. The Investigative Committee denied the reports as false and instead opened a criminal libel case against the media publication. However, no information regarding a new appointment for Pryvalau has been made public yet.

The new BIPART research on the role of regional executive committees within the state system reveals that it is unusual for Lukashenka's assistant-inspectors to be reappointed to lower-level executive committees. This might support the interpretation that Pryvalau's dismissal, regardless of the reason, created a staff shortage. Ironically, Parkhamovich previously oversaw the head of Homiel region, Ivan Krupko, whom he will now report to. Although the appointment is formally a demotion, heads of city executive committees arguably exercise greater executive powers than assistant-inspectors, whose primary role is oversight.

## Changes at the district level

In May and June, new heads of district executive committees were appointed in Mazyr, Petrykau and Ashmiany. On 12 May, Aliaksandr Verameeu was appointed as head of the Mazyr district, promoted from Petrykau district. State media emphasised that Lukashenka appointed the promising farm manager during one of his propaganda "work trips" to Petrykau district in 2024. Less than a year later Verameeu has been promoted to the larger and more significant Mazyr district. This year has officially been designated "The Year of Belarusian Women": Lukashenka continues to mark it by ousting women from public office; Verameeu replaced Alena Paulechka, who had headed Mazyr district for the past decade.

The other appointments are likely regular staff rotations. On 11 June, Yauhen Shkrobat, former first deputy chairman and head of the agriculture and food department of the Zhytkavichy District, replaced Verameeu in the Petrykau district. Andrei Klysheuski, previously the deputy chairman overseeing construction, housing and utilities, was promoted to chairman of the Ashmiany District Executive Committee.

## Changes in large state enterprises

On 12 May, Aliaksandr Sakovich was appointed general director of the Belarusian Steel Works (BMZ). The head of Lukashenka's administration, Dzmitry Kruty, said that the appointment is the result of decreased production output of one of the largest metallurgical state enterprises. The new head has been transferred from his role as head of the industrial policy department in the Secretariat of the Council of Ministers. Sakovich previously worked as deputy director at BMZ. Independent media interpret his appointment as an attempt to scapegoat the former director of BMZ whilst giving the appearance of change. A change in leadership alone, however, is unlikely to revive production at one of Belarus's largest sanctioned enterprises, which continues to struggle with restoring exports amid the emerging economic downturn in its main market, Russia.

On 11 June, new directors were appointed at the Belkamunmash

and Lidselmash enterprises. Mikhail Symanovich was promoted from Deputy Director for Economics and Finance to head Belkamunmash, whilst Eduard Shal' transfers from his role as director of Lidagraprommash to Lidselmash. These reshuffles likely follow a similar logic. In May, independent media published an analysis of the revenues of Belarusian large state-run enterprises in Russia, which found a collapse in the enterprises' profits. Both BMZ and Belkamunmash are mentioned among companies with the worst export revenues.

## Changes in Lukashenka's administration

On 12 May, Aliaksandr Shundryk was appointed as head of the directorate-general for personnel policy in Lukashanka's administration. The significance of this role is shown in new BIPART research, analysing the role of the Presidential Administration (PA) in the state system and how it controls most appointments across the state system. Personnel appointments is one of the principal mechanisms through which Lukashenka maintains his personal control over the state apparatus. The directorate-general for personnel policy selects and evaluates candidates, reviews their employment history, and conducts loyalty/background checks in coordination with security services. The official bio of the latest official in this role appears to be missing, although in 2024 Shundryk was mentioned in the state media as having headed the regional policy directorate of the PA.

On 11 June, Yury Khamutouski was appointed to replace Shundryk as head of the regional policy directorate. Khamutouski has been promoted from deputy head of the economic directorate. Meanwhile, Henadz Akstilovich has been appointed head of the directorate for work with citizens' and legal entities' appeals, promoted from first deputy head of the directorate. These reshuffles suggest an ongoing technical rotation within the PA; due to limited information on these appointments available in open sources, however, the explanation remains uncertain. Independent media note that Lukashenka's press service rarely covers personnel appointments on levels lower than deputy head.

## Changes in the Ministry of Foreign Affairs

## Belarus to close its embassy in Equatorial Guinea

On 24 June, the government adopted a resolution to close its embassy in Equatorial Guinea. The embassy was approved in December 2023 following Lukashenka's visit to the country in search of new markets for trade. Although Belarus took preparatory steps, no ambassador was ever appointed and the embassy never opened, suggesting cooperation failed to progress beyond initial agreements.

## Concurrent postings in the diplomatic corps

Two ambassadors received concurrent postings in the Middle East region. On 11 June, Yauhen Sabaleuski, Ambassador to Egypt, was concurrently appointed Ambassador to Libya, adding the role to his existing accreditations in Algeria, Oman, and Sudan. Meanwhile, Aliaksandr Aharodnikau, Ambassador to

Uzbekistan, received a concurrent appointment to Afghanistan.

## New bill tightens control over religious affairs

On 30 June, the Belarusian parliament approved a law that would transfer oversight of the Commissioner for Religious and Ethnic Affairs* from the Council of Ministers to Lukashenka. Since 2020,  Aliaksandr Rumak, former Deputy Minister of Labour and Social Protection, has served as the commissioner. Under the revised law, the commissioner will be appointed by and report to Lukashenka, with overall supervision by the Presidential Administration, rather than the government. Changes were presented in state media as an "increase in the status" of the Commissioner for Religious and Ethnic Affairs, although its formal powers were unaffected.

Direct reporting of the Commissioner for Religious and Ethnic Affairs to Lukashenka might be explained by its increased importance in ongoing attempts to reestablish relations with the West. Religious diplomacy is an important part of the regime's bargaining efforts, expecting sanctions relief in return for the release of political prisoners. Notable examples include the recent visit of the American evangelist Franklin Graham as part of bilateral talks with the US, and the development of Belarus-Vatican relations over recent years. The Commissioner for Religious and Ethnic Affairs might have a supporting role in these engagements. For example, Rumak was used to justify to the Vatican the detention of a Polish catholic monk on espionage charges.

The bill signals further centralisation of state control over the religious sphere. It is adopted against the background of systematic persecution of religious communities and clergy in Belarus since the 2020 protests. Another aspect is the role of the Russian orthodox church in the Kremlin's war propaganda, which heavily targets Belarus. In June, Rumak met the head of the Russian church during the latter's visit to Brest. In his propaganda speech Patriarch Kirill urged orthodox clergy to "strengthen young people's loyalty to the homeland and the church," using a slogan widely associated with Russian security forces and militaristic propaganda.

**The Office of the Commissioner for Religious and Ethnic Affairs functions as the government body in the field of freedom of conscience, freedom of religion and religious organisations.*

## Salaries for Belarusian officials grow to record high

Belarusian civil servants' salaries are outpacing the national average, according to an independent media analysis of data from the National Statistics Committee. Analysts note that this disparity is particularly pronounced in Belarusian regions, where average wages remain significantly lower than in the capital. State administration salaries exceed regional average wages by ~40-50% across much of Belarus, making civil service jobs amongst the best-paid positions outside Minsk. This is interpreted as an effort to maintain stability of the state apparatus and counter human capital flight.

## Навіны даследчага цэнтра BIPART




У траўні BIPART апублікаваў новае даследаванне «Міні-лукашэнкі на месцах: улада, кантроль і кадры ў аблвыканкамах Беларусі», у якім разглядаецца роля аблвыканкамаў у сістэме дзяржаўнага кіравання Беларусі. У даследаванні прааналізавана, як функцыянуе вертыкаль улады на рэгіянальным узроўні, логіка прызначэнняў кіраўнікоў рэгіёнаў і змена ролі выканкамаў пасля пратэстаў 2020 года.

У чэрвені BIPART апублікаваў новае даследаванне аб ролі Адміністрацыі прэзідэнта, аналізуючы, як гэты орган улады прайшоў шлях ад дапаможнай структуры пры кіраўніку дзяржавы да аднаго з галоўных цэнтраў прыняцця і кантролю палітычных рашэнняў.

## Навіны дзяржкіравання (травень – чэрвень 2026 г.)




# Змены ва ўрадзе

### Новы міністр прыродных рэсурсаў

11 чэрвеня Максім Лысенка быў прызначаны міністрам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Яго павысілі з пасады першага намесніка міністра пасля таго, як былы міністр Сяргей Масляк быў затрыманы за карупцыю — рэдкі выпадак затрымання пасадоўца такога ўзроўню. Гэтае руціннае кадравае рашэнне падкрэслівае перфарматыўны характар барацьбы з карупцыяй у Беларусі. Крымінальныя справы выкарыстоўваюцца Лукашэнкам для ўмацавання ўласнага іміджу ў дзяржаўных СМІ і кантролю дысцыпліны сярод чыноўнікаў. Карупцыянераў замяняюць намеснікі, і толькі малая частка

затрыманых трапляе ў турмы, а асуджаныя часта адбываюць адносна кароткія тэрміны.

Лысенка нарадзіўся ў 1984 годзе і мае тры вышэйшыя адукацыі: скончыў Дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, Мінскі інстытут кіравання і Акадэмію кіравання. Яго кар’ерны шлях тыповы для беларускіх міністраў: амаль увесь прафесійны досвед у адным міністэрстве з кароткай ратацыяй у мясцовых уладах для «павышэння кваліфікацыі». Пасля больш чым дзесяцігадовай працы ў рэгіянальных аддзяленнях Міністэрства прыродных рэсурсаў у 2021–2025 гадах ён займаў пасаду старшыні Дзяржынскага райвыканкама.

## Аналітыкі прадказваюць перастаноўкі сярод топаў сілавікоў

Прызначаючы новага міністра прыродных рэсурсаў, Лукашэнка абвясціў аб планах перадаць міністэрству Дзяржінспекцыю аховы жывёльнага і расліннага свету, якая цяпер знаходзіцца пад ягоным непасрэдным кантролем. Нягледзячы на тое што гэта, верагодна, не паўплывае на паўнамоцтвы інспекцыі, гэтае рашэнне азначае відавочную страту статусу для інспекцыі і яе кіраўніка Юрыя Церцеля, брата старшыні КДБ Івана Церцеля. Хоць змены могуць быць проста тэхнічнымі, яны выклікалі спекуляцыі пра тое, што «клан Церцеляў» губляе ўплыў. Аналітыкі тлумачаць, што гэта сведчыць аб паступовым адсоўванні на другі план цяперашняй эліты сілавікоў напярэдадні будучай перастаноўкі, якую рэжым можа выкарыстаць для імітацыі перамен.

Папярэднія перастаноўкі ў сілавых структурах могуць пацвярджаць гэтую інтэрпрэтацыю. Снежаньскія прызначэнні выхадцаў з КДБ на пасады старшыні Следчага камітэта і Генеральнага пракурора сведчылі аб змене логікі рэпрэсій. Паралельна з брутальнымі рэпрэсіямі, хоць яны ўсё яшчэ актыўна выкарыстоўваюцца, пашыраюцца больш дыскрэтныя формы, такія як маніпуляцыі і кантраляваны ціск. Праваабаронцы адзначаюць трэнд пашырэння «схаваных рэпрэсій», калі закрытыя суды, падпіскі аб неразгалошванні і запалохванне ўсё часцей выкарыстоўваюцца, каб прыхаваць маштаб рэпрэсій, захоўваючы высокі ўзровень ціску на грамадства. Нядаўні кейс — гэта пераслед студэнтаў Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта. Нягледзячы на заявы сілавікоў з адмаўленнем масавых затрыманняў, па ўсёй краіне прайшлі палітычна матываваныя ператрусы і арышты. Пры гэтым публічная рыторыка ўсё часцей накіравана на прымяншэнне рэпрэсій.

Яшчэ адзін фактар, што сігналізуе пра магчымыя перастаноўкі, гэта ўзрост чыноўнікаў на кіруючых пасадах: многія сілавікі на высокіх пасадах ужо набліжаюцца да пенсійнага веку. Напрыклад, у траўні быў адпраўлены ў адстаўку 68-гадовы намеснік пракурора Аляксей Стук, які займаў гэтую пасаду з 2008 года. Незалежныя СМІ характарызуюць яго як аднаго з архітэктараў масавых рэпрэсій. Таксама кіраўнікі асноўных сілавых структур былі прызначаны яшчэ ў 2020 годзе, што робіць іх знаходжанне

на пасадах даволі доўгім паводле стандартаў рэжыму. Будучыя перастаноўкі таксама закрануць войска: пасля нядаўняй праверкі Лукашэнка абвясціў аб падрыхтоўцы да кадравых змен у арміі. Такім чынам, далейшыя перастаноўкі сілавікоў становяцца рэальнай перспектывай у бліжэйшыя гады.

## Змены ў мясцовай адміністрацыі

### Новы мэр Гомеля

12 траўня Руслан Пархамовіч быў прызначаны старшынём Гомельскага гарвыканкама. Пархамовіч нарадзіўся ў 1980 годзе ў Магілёве, мае дыпломы па будаўніцтве і бухгалтарскім уліку Магілёўскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта (цяпер — Беларуска-Расійскі ўніверсітэт) і Акадэміі кіравання. Апошні год ён быў памочнікам-інспектарам Лукашэнкі ў Гомельскай вобласці, а да гэтага — міністрам архітэктуры і будаўніцтва ў 2020–2025 гадах. Незалежныя медыя інтэрпрэтавалі яго прызначэнне як прыкмету дэфіцыту кадраў: Пархамовіч не мае ніякага досведу працы ў Гомельскай вобласці, акрамя папярэдняй пасады. У чэрвені ў СМІ з'явілася інфармацыя, што былы кіраўнік Гомеля Уладзімір Прывалаў неўзабаве пасля звальнення стаў фігурантам крымінальнай справы па абвінавачванні ў махлярстве, звязаным з перапродажам кватэр. Следчы камітэт абверг гэтыя паведамленні і распачаў крымінальную справу аб паклёпе супраць выдання. Тым не менш ніякай інфармацыі аб новым прызначэнні Прывалава пакуль што няма.

Згодна з новым даследаваннем BIPART аб ролі аблвыканкамаў у дзяржаўнай сістэме, памочнікаў-інспектараў Лукашэнкі даволі рэдка прызначаюць на пасады ў выканкамы ніжэйшага ўзроўню. Гэта часткова пацвярджае інтэрпрэтацыю, што звальненне Прывалава, незалежна ад прычыны, стварыла дэфіцыт кадраў. Іранічна, што Пархамовіч раней кантраляваў кіраўніка Гомельскай вобласці Івана Крупко як памочнік прэзідэнта, а цяпер быў пераведзены яму ў падпарадкаванне. Аднак, нягледзячы на тое што фармальна гэта паніжэнне, старшыні выканкамаў маюць больш выканаўчых паўнамоцтваў, чым памочнікі прэзідэнта, якія займаюцца пераважна кантролем за выкананнем рашэнняў Лукашэнкі.

### Змены на ўзроўні раёнаў

У траўні – чэрвені ў Мазырскім, Петрыкаўскім і Ашмянскім раёнах былі прызначаны новыя кіраўнікі райвыканкамаў. 12 траўня кіраўніком Мазырскага раёна быў прызначаны Аляксандр Верамееў, яго павысілі з Петрыкаўскага раёна. Дзяржаўныя СМІ акцэнтавалі, што Лукашэнка прызначыў перспектыўнага кіраўніка СУП «Палессе-Аграінвест» старшынём Петрыкаўскага раёну падчас адной са сваіх прапагандысцкіх «рабочых паездак» у 2024 годзе. Менш чым праз год Верамееў пайшоў на павышэнне, узначаліўшы большы Мазырскі раён. У «Год беларускай жанчыны» Лукашэнка працягвае выціскаць жанчын з дзяржаўных пасад: Верамееў замяніў Алену Паўлечку, якая ўзначальвала Мазырскі раён апошнія дзесяць гадоў.

Іншыя прызначэнні, верагодна, тлумачацца звычайнай ратацыяй. 11 чэрвеня ў Петрыкаўскі раён замест Аляксандра Верамеева быў прызначаны Яўген Шкробат, былы першы намеснік і начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Жыткавіцкага раёна. Андрэй Клышэўскі быў павышаны да старшыні Ашмянскага райвыканкама з пасады намесніка старшыні, адказнага за будаўніцтва і ЖКГ.

## Змены ў буйных дзяржаўных прадпрыемствах

12 мая Аляксандр Саковіч быў прызначаны генеральным дырэктарам «Беларускага металургічнага завода» (БМЗ). Кіраўнік адміністрацыі Лукашэнкі Дзмітрый Круты адзначыў, што прызначэнне звязана са зніжэннем аб'ёмаў вытворчасці на прадпрыемстве. Новы кіраўнік БМЗ Саковіч пераходзіць з пасады кіраўніка аддзела прамысловай палітыкі Апарата Саўміна, а раней працаваў намеснікам дырэктара ў гэтым жа холдынгу. Незалежныя СМІ інтэрпрэтуюць гэтае прызначэнне як імітацыю перамен з мэтай зваліць на былога кіраўніка БМЗ адказнасць за праблемы на прадпрыемстве. Аднак змена кіраўніцтва наўрад ці дапаможа аднаму з найбуйнейшых санкцыйных прадпрыемстваў аднавіць паказчыкі і вырашыць сістэмныя праблемы з экспартам на фоне эканамічнага спаду на асноўным рынку ў Расіі.

11 чэрвеня новых кіраўнікоў прызначылі на прадпрыемствах «Белкамунмаш» і «Лідсельмаш». Міхал Сымановіч быў павышаны да кіраўніка з пасады намесніка дырэктара па эканоміцы і фінансах у «Белкамунмашы». Эдуард Шаль быў прызначаны дырэктарам «Лідсельмаша», яго перавялі з падобнай пасады ў «Лідаграпраммашы». Гэтыя перастаноўкі, верагодна, прытрымліваліся той жа логікі, што і прызначэнне на БМЗ. У траўні незалежныя медыя апублікавалі аналіз прыбыткаў буйных беларускіх дзяржпрадпрыемстваў на расійскім рынку. Большасць прадпрыемстваў паказала правальнае падзенне паказчыкаў: і БМЗ, і «Белкамунмаш» — у спісе сярод найгоршых па экспартных выніках.

## Змены ў адміністрацыі Лукашэнкі

12 траўня Аляксандр Шундрык быў прызначаны кіраўніком галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі адміністрацыі Лукашэнкі. Згодна з новым даследаваннем BIPART пра ролю Адміністрацыі прэзідэнта (АП) у сістэме дзяржкіравання, кантроль АП за ўсімі значнымі прызначэннямі ў краіне з'яўляецца адным з асноўных механізмаў, з дапамогай якіх Лукашэнка падтрымлівае асабісты кантроль над дзяржаўным апаратам. Генеральнае ўпраўленне кадравай палітыкі адбірае і ацэньвае кандыдатаў, правярае іх працоўную гісторыю, біяграфію і разам з сілавікамі праводзіць праверкі лаяльнасці сярод патэнцыйных прызначэнцаў. Афіцыйнай біяграфіі Шундрыка няма ў адкрытых крыніцах, але ён у 2024 годзе згадваўся ў дзяржаўных СМІ як кіраўнік упраўлення рэгіянальнай палітыкі ў АП.

11 чэрвеня Юры Хамутоўскі быў прызначаны кіраўніком

упраўлення рэгіянальнай палітыкі замест Шундрыка, атрымаўшы павышэнне з пасады намесніка кіраўніка эканамічнага ўпраўлення. Генадзь Аксціловіч быў прызначаны кіраўніком упраўлення па працы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, таксама атрымаўшы павышэнне з пасады першага намесніка кіраўніка ўпраўлення. Гэтыя перастаноўкі сведчаць пра тэхнічную ратацыю кадраў у АП, аднак з-за абмежаванай інфармацыі аб гэтых прызначэннях у адкрытых крыніцах, прычына застаецца невядомай. Незалежныя СМІ адзначаюць, што прэс-служба Лукашэнкі рэдка асвятляе кадравыя прызначэнні ў АП на ўзроўні ніжэй за намесніка кіраўніка.

## Змены ў Міністэрстве замежных спраў

### Беларусь адмаўляецца ад пасольства ў Экватарыяльнай Гвінеі

24 чэрвеня ўрад прыняў пастанову аб закрыцці пасольства ў Экватарыяльнай Гвінеі. Адкрыццё пасольства было зацверджана ў снежні 2023 года пасля візіту Лукашэнкі. Нягледзячы на падрыхтоўчыя крокі, пасол так і не быў прызначаны, а пасольства не адкрылася, што сведчыць пра тое, што рэжыму не ўдалося наладзіць супрацоўніцтва з цэнтральнаафрыканскай краінай.

### Сумесныя пасады ў дыпламатычным корпусе

Два паслы атрымалі дадатковыя прызначэнні ў рэгіёне Блізкага Усходу. 11 чэрвеня пасол у Егіпце Яўген Сабалеўскі быў адначасова прызначаны паслом у Лівіі, дадаўшы гэту пасаду да сваіх акрэдытацый у Алжыры, Амане і Судане. Пасол ва Узбекістане Аляксандр Агароднікаў атрымаў дадатковае прызначэнне ў Афганістане.

## Новы законапраект узмацняе кантроль над рэлігійнай сферай

30 чэрвеня Савет Рэспублікі ўхваліў закон, які перадае кантроль над упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў* ад Саўміна непасрэдна да Лукашэнкі. З 2020 года гэтую пасаду займае Аляксандр Румак, былы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны. Згодна з новым законам, упаўнаважаны будзе падпарадкоўвацца і прызначацца Лукашэнкам, а агульны кантроль будзе ажыццяўляцца Адміністрацыяй прэзідэнта, а не ўрадам. Змены былі пададзеныя ў дзяржСМІ як «павышэнне статусу» дзяржаўнага органа, хоць яго фармальныя паўнамоцтвы засталіся нязменнымі.

Непасрэднае падпарадкаванне ўпаўнаважанага па справах рэлігій Лукашэнку можна растлумачыць узрастаннем важнасці гэтага дзяржаўнага органа ў перамовах рэжыму з Захадам. Рэлігійная дыпламатыя мае істотную ролю ў намаганнях рэжыму абмяняць вызваленне палітвязняў на зняццё санкцый. Сярод прыкметных прыкладаў — нядаўні візіт Фрэнкліна Грэма ў межах перамоў паміж Беларуссю і ЗША, а таксама развіццё адносін паміж Беларуссю і Ватыканам у апошнія гады. Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, імаверна, адыгрывае дапаможную ролю ў гэтых узаемадзеяннях. Напрыклад, у

мінулым годзе Румаку даручылі апраўданне перад Ватыканам затрымання польскага каталіцкага манаха па абвінавачванні ў шпіянажы.

Новы закон сведчыць пра далейшую цэнтралізацыю дзяржаўнага кантролю над рэлігійнай сферай. Ён прымаецца на фоне сістэматычнага пераследу вернікаў і духавенства ў Беларусі пасля пратэстаў 2020 года. Дадатковы аспект — роля расійскай праваслаўнай царквы ў ваеннай прапагандзе Крамля, якая ў тым ліку скіравана на беларусаў. У чэрвені ўпаўнаважаны па справах рэлігій сустракаў кіраўніка расійскай царквы падчас яго візіту ў Брэст. У прапагандысцкай прамове патрыярх Кірыл заклікаў праваслаўнае духавенства ўмацоўваць адданасць моладзі радзіме і царкве, выкарыстоўваючы лозунг, папулярны сярод расійскіх сілавікоў і мілітарысцкай прапаганды.

**Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў функцыянуе як дзяржаўны орган у галіне свабоды сумлення, свабоды веравызнання і рэлігійных арганізацый.*

## Высокія заробкі беларускіх чыноўнікаў

Заробкі дзяржслужачых у Беларусі перавышаюць сярэдні паказчык па краіне, паводле аналізу дадзеных Белстата, які апублікавалі незалежныя медыя. Аналітыкі адзначаюць, што гэтая розніца асабліва заўважная ў рэгіёнах, дзе сярэдні заробак застаецца значна ніжэйшым. Заробкі чыноўнікаў па рэгіёнах перавышаюць сярэднія прыкладна на 40–50%, што робіць дзяржаўную службу адной з самых высокааплатных прац за межамі Мінска. Такія высокія заробкі дзяржслужбоўцаў інтэрпрэтуюць як спробу падтрымліваць стабільнасць дзяржаўнага апарату Лукашэнкі і супрацьстаяць адтоку працоўнай сілы.

info@bipart.eu | facebook | X (Twitter) | LinkedIn | Threads | bipart.eu